# Мова – галоўны ідэнтыфікатар беларускасці

**У Міжнародны дзень роднай мовы абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі падрыхтавала шмат мерапрыемстваў, на якіх усе прысутныя змаглі паразважаць, што азначае для кожнага з іх наш нацыянальны скарб, беларуская мова, а таксама прачытаць свой любімы верш на роднай мове.**

Распачалося свята літаратурным марафонам «З табой маё слова, Радзіма», які прайшоў у Магілёўскай абласной бібліятэцы. Удзел у ім бралі пісьменнікі Прыднепроўскага краю, навучэнцы розных адукацыйных устаноў горада.



– Шануй сваю мову, свае песні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае – гэта спадчына і вялікі нацыянальны скарб! – неаднаразова падкрэслівалі падчас мерапрыемства ўдзельнікі марафону. – Дзень роднай мовы асаблівы для кожнай нацыі, бо няма народа без мовы, няма мовы без яго носьбіта. Нам у спадчыну засталася ўнікальная мова – жывая і мілагучная, песенная і паэтычная, старажытная і сучасная.

Затым эстафету мерапрыемства прыняў МДУ імя А.А.Куляшова. Тут шчыра віталі і віншавалі пераможцаў конкурсу «І кружыцца планета Куляшова».

Конкурс аб'яднаў больш за 300 удзельнікаў з розных рэгіёнаў Беларусі. Пераможцаў вызначылі ў некалькіх намінацыях: «І вечнасць радка як вечнасць жыцця», «Гістарычная памяць маёй сям'і ў гісторыі маёй краіны», «Ёсць у паэта свой аблог цалінны», «Знаёмыя незнаёмцы: нашы сучаснікі». Дыпломамі былі адзначаны школьнікі, студэнты і выкладчыкі з усёй краіны. Іх пераможцам уручалі старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Казека, старшыня праўлення Магілёўскага абласнога аддзялення Фонду міру Андрэй Нікіцін, прарэктар па вучэбнай рабоце МДУ імя А.А. Куляшова, член Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Ясеў.



Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў суправаджалася выступленнямі студэнтаў універсітэта і ўдзельнікаў тэатральнай студыі «У кропку!» Магілёўскай ДШМ №1 імя І.М.Лучанка пад кіраўніцтвам члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Вольгі Бяловай.



Потым удзельнікі мерапрыемства паглядзелі прадстаўленне абласнога маладзёжнага патрыятычнага праекта «Песня роднай зямлі». Яго бліскуча паказалі навучэнцы Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.

– Уразіла тое, што шмат пераможцаў з сельскіх школ і сярэдніх навучальных устаноў. Для мяне як пісьменніка гэта сведчыць пра тое, што наша моладзь цікавіцца роднай мовай, – падзяліўся сваімі ўражаннямі Алесь Казека. – Лічу, што мова – галоўны ідэнтыфікатар нашай беларускасці, бо ў ёй заключаецца слова і любоў да роднай зямлі.

**Таццяна ПАДЛІПСКАЯ.**

*Фота аўтара.*